что при обработке конечных данных сервер (т. е. сайт) посетит 21 000 уникальных пользователей, а количество кликов на баннер составит 1 300.

Исходя из данных веб-издателя известно, что в среднем за неделю пользователь посещает сервер 4 раза (150 000 посещений главной страницы, 37 000 уникальных пользователей). Следовательно, рекламу пользователь в среднем видит 4 раза. Получаем, что *количество уникальных пользователей*, которым будет показана реклама равно 37000 чел. В среднем пользователь видел рекламу 4 раза, предположим, что ее запомнили 65% от увидевших ее уникальных пользователей, т.е. получаем 24 050 пользователей, осведомленных о рекламе модного показа «Mark Formelle в Любани», что значительно превосходит количество аудитории показа в Центре, но хорошо для *продвижения марки* бренда. *Телеролики* марки можно показать на местном ТВ и экранах в городе и Центре культуры за две недели до показа.

Также необходимо изготовить *мерч – рекламную продукцию* для посетителей показа – канцелярские товары с нанесением логотипа «Mark Formelle» – ручки, блокноты, а для администрации города и Центра культуры – кружки, ежедневники, брелоки, настольные календари и др.

Планируется, что проведение модного показа в Любани и массированное рекламно-информационное сопровождение проекта будет способствовать росту выручки от последующих продаж бренда «Mark Formelle» на 10% относительно предыдущего периода.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Официальный сайт Mark Formelle [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://markformelle.by/. – Дата доступа: 24.01.2020.

Занько Т. В., студент 530м группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Галковская Ю. Н.,
кандидат педагогических наук, доцент

# КРАЯЗНАЎСТВА ЯК НАКІРУНАК ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК: З ВОПЫТУ РАБОТЫ ГАНЦАВІЦКАЙ РЦБС

Краязнаўчую дзейнасць бібліятэк цяжка пераацаніць: з усіх установ і арганізацый, якія займаюцца краязнаўствам, бібліятэкі валодаюць універсальным фондам дакументаў і застаюцца найбольш даступнымі для ўсіх катэгорый карыстальнікаў. Сістэмы бібліятэк ахопліваюць самыя аддаленыя і маланаселеныя тэрыторыі, а сельскія бібліятэкі часцяком з'яўляюцца адзінымі крыніцамі краязнаўчай інфармацыі для насельніцтва.

Краязнаўства сёння ўваходзіць у лік прыярытэтных змястоўных напрамкаў работы публічных бібліятэк, як універсальных навуковых, так і гарадскіх, раённых, сельскіх. Досвед працы з розных рэгіёнаў краіны сведчыць, што адначасова з павелічэннем аб'ёму дзейнасці – па колькасці выкананых запытаў, праведзеных мерапрыемстваў, колькасці карыстальнікаў, пашырэнню даведачна-пошукавага апарату і іншых параметрах – у бібліятэчнага краязнаўства адбываюцца істотныя змены .

Сёння мы маем справу з якасна іншай бібліятэкай, канцэптуальныя змены якой найбольш выразна прасочваюцца ў краязнаўства. З простай культурнай установы, арыентаванай на збор, захоўванне і прасоўванне, перш за ўсё друкаваных дакументаў, бібліятэкаператвараецца ў шматфункцыянальны інфармацыйны комплекс.

На цяперашні час краязнаўства знаходзіцца на ўздыме, які абумоўлены адраджэннем беларускай гісторыі, культуры, мовы, узрастаннем цікавасці да мінулага, сваіх каранёў, да сваёй "малой Радзімы". Грамадскія патрэбы ў краязнаўчай інфармацыі задавальняюць не толькі архівы і музеі, але і бібліятэкі - яны з’яўляюцца найбольш даступнымі сацыяльнымі інстытутамі. Мінулае і сённяшні дзень краю, вопыт папярэдніх пакаленняў, іх традыцыі, побыт, звычаі, прыродная своеасаблівасць мясцовасці і многае іншае – усё гэта часта становіцца тэмай шматлікіх бібліятэчных мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіцце бібліятэчнага краязнаўства стымулюецца як на дзяржаўным, так і на мясцовым узроўні. Рыхтуюцца метадычыя рэкамендацыі, праводзяцца канферэнцыі і семінары [5, с. 20].

ДУК ”Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, якая з 2016 года аб’ядноўвае 19 публічных бібліятэк, кожная з якіх мэтанакіравана і планамерна вядзе краязнаўчую працу. Менавіта таму на дадзеным этапе бачыцца актуальным абагульненне вопыту краязнаўчай дзейнасці і аналіз перспектываў.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі (КДБ) – гэта сукупнасць паслядоўных працэсаў, якія ажыццяўляюцца бібліятэчнымі спецыялістамі ў рамках сваіх службовых абавязкаў па дакументнаму і інфармацыйнаму забеспячэнню краязнаўства.

Асноўныя працэсы КДБ:

• фарміраванне краязнаўчага фонду;

•стварэнне краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата; •фарміраванне сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў; •даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае інфармаванне абанентаў;

• вывучэнне асаблівасцяў і профілю краю, складу і краязнаўчых патрэбаў абанентаў;

• прапаганда краязнаўчых дакументаў;

•выдача краязнаўчых дакументаў абанентам, аказанне паслуг па краязнаўстве;

• метадычнае забеспячэнне КДБ;

•наладжванне сувязей з установамі і арганізацыямі, якія вядуць краязнаўчую працу.

Гэтыя працэсы забяспечваюць стварэнне сістэмы рэсурсаў і паслуг бібліятэкі па краязнаўстве, а таксама магчымасць доступу да іх карыстальнікаў бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карыстальнік бібліятэкі з'яўляецца актыўным суб'ектам краязнаўчай дзейнасці: ён выкарыстоўвае вынікі гэтай дзейнасці, непасрэдна ўдзельнічае ў правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў, у папулярызацыі вынікаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк (КДБ), у фінансавым і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні КДБ.

Асаблівасць КДБ у тым, што яна разлічана на ўвесь кантынгент абанентаў, на ўсё мясцовае насельніцтва, а таксама і на аддаленых карыстальнікаў (даследчыкаў края, ураджэнцаў, якія пражываюць за яго межамі). Разам з тым, бібліятэка павінна ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход да абслугоўвання абанентаў, а для гэтага трэба вывучаць патрэбнасці абанентаў.

Галоўным дакументам, які вызначаў мэты, задачы, асноўныя напрамкі КДБ, яе арганізацыйную структуру, стварыў нарматыўную базу для стварэння ў РБ сістэмы краязнаўчай дзейнасці бібліятэк да 2010 года з'яўлялася "Палажэнне аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь", зацверджанае Міністэрствам культуры РБ у 1993 годзе.

У бібліятэках Ганцавіцкай ЦБС "Палажэння аб краязнаўчай рабоце" няма. Усе аддзелы Ганцавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя В.Ф. Праскурава займаюцца краязнаўчай работай, але кожны па свайму профілю, кожны супрацоўнік бібліятэкі ўдзельнічае ў КДБ незалежна ад пасады і ўчастка работы. Самастойнае планаванне і справаздача КДБ у бібліятэках Ганцавіцкай РЦБС не вядзецца, але ў "Дзённіку работы" у асобнай графе кожны дзень памячаецца колькасць выданых чытачам краязнаўчых дакументаў.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі – гэта інфармацыйная пошукавая сістэма (ІПС) у дакументнай ці/і электроннай формах, якакя прызначана аптымізаваць пошук краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, арыентацыю ў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца галоўным элементам. Функцыя КДБА – забеспячэнне аператыўнага і якаснага доступу карыстальнікаў да бібліятэчнай, бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, па вызначанаму рэгіёну ці мясцовасці КДБА [2, с. 19].

КДБА Ганцавіцкай раённай бібліятэкі імя В.Ф. Праскурава ўяўляе сабой арганізаваную сукупнасць і складаецца з:

• краязнаўчай картатэкі;

• фонда даведачных і бібліяграфічных краязнаўчых выданняў;

• фонда неапублікаваных дакументаў.

У Ганцавіцкай ЦБС імя В.Ф. Праскурава краязнаўчая доступ да карязнаўчай картатэкі забяспечаны праз аддзел абслугоўвання і інфармацыі. Храналагічны ахоп з 1968 года да цяперашняга часу. Аб'ем кататэкі складае каля 9 000 картак. Тэматыка картатэкі універсальная.

Картатэка мае наступныя раздзелы:

- Край у цэлым.

- Мясцовыя органы ўлады і кіраванне іх дзейнасцю. Грамадскае жыццё краю.

- Прырода і прыродныя рэсурсы. Экалогія.

- Эканоміка краю.

- Ахова здароўя. Медыцынскія ўстановы. Фізічная культура і спорт.

- Рэлігійнае жыцце ў краі.

- Культурнае будаўніцтва. Асвета. Друк.

- Мастацтва. Край у творах мастацтва.

- Літаратурнае жыцце. Край у мастацкай літаратуры. Фальклор.

- Гісторыя. Этнаграфія. Археалогія краю [2, с.20].

Бібліятэкі Ганцавіцкай РЦБС не маюць асабістых краязнаўчых БД.

Ганцавіцкая раённая бібліятэка імя В.Ф. Праскурава стварае іфармацыйную прадукцыю па краязнаўстве. Гэта:

• інфармацыйныя і інфармацыйна-рэкламныя буклеты (“Святыні”, “Ганцаўшчына кніжная” і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• літаратурна-мастацкія выданні (“Легенды і паданні Ганцаўшчыны” і інш.);

• гісторыка-дакументальныя зборнікі (“Сем цудаў Ганцаўшчыны”) і інш.);

• біябібліяграфічныя і аўтабіяграфічныя зборнікі вядомых пісьменнікаў Ганцаўшчыны, дзе змешчана іх біяграфія, падборка вершаў, сцэнарны матэрыял і бібліяграфія;

• зборнікі вершаў мясцовых літаратараў[2, с. 20-21].

Такім чынам, Ганцавіцкая раённая бібліятэка імя В.Ф. Праскурава паспяхова рэалізуе краязнаўчы накірунак сваёй дзейнасці праз фарміраванне, апрацоўку і папулярызацыю краязнаучых дакументаў усіх бібліятэк раёна, аб’яднаных у краязнаўчы фонд.

Для арганізацыі паспяховай краязнаўчай дзейнасці бібліятэчнай сеткі неабходна пастаянна ўлічваць магчымыя складанасці і прадбачваць іх вынікі. Адной з формаў выяўлення праблем рознага характару забеспячэння краязнаўчай працы бібліятэк 'яўляецца правядзенне даследаванняў, маніторынгаў, анкетавання .

У пошуках новых шляхоў прапаганды краязнаўчага матэрыялу масавыя бібліятэкі нярэдка выходзяць за межы чыста бібліятэчных формаў. Бібліятэкі, якія абслугоўваюць невялікія тэрыторыі, часта з'яўляюцца цэнтрамі краязнаўчага руху, якія аб'ядноўваюць яго ўдзельнікаў у арганізацыі народных музеяў, зборы матэрыялу аб сваім краі [2, с. 19].

Пры ажыццяўленні краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі ЦБС выкарыстоўваюць розныя ***формы і метады*** нагляднай, вуснай і пісьмовай папулярызацыі КД:

• краязнаўчыя гутаркі, тыдні, месячнікі папулярызацыі краязнаўчай літаратуры;

• краязнаўчыя чытанні, клубы, аб’яднанні краязнаўцаў, прэзентацыі, дыспуты, віктарыны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовай улады, выдатнымі людзьмі края, пісьменнікамі – аўтарамі краязнаўчых твораў, навукоўцамі;

• конкурсы на лепшага знатака края або краязнаўчай літаратуры;

• гульні – вандраванні па родным краі;

• удзел у арганізацыі і правядзенні масавых краязнаўчых мерапрыемстваў: дні горада, сяла, вуліцы, установы, мясцовыя радаводы.

Спецыфіка бібліятэчнага-бібліяграфічнага краязнаўства ў тым, што яно выходзіць за межы чыста бібліятэчных паслуг па краязнаўстве і можа ўключаць такія элементы як:

- арганізацыя экскурсій па знакамітых мясцінах;
- пошукавая, даследчая, экспедыцыйная работа;
- стварэнне летапісу края;
- запісы ўспамінаў старажылаў, мясцовага фальклору, гаворак.

Усе гэтыя формы бібліятэкі выкарыстоўваюць, калі гэта трэба дакладнаму абаненту, групе, калектыву, або мясцоваму згутраванню цалкам [6, с.11].

***Рэклама КДБ*** ажыццяўляцца не толькі ў бібліятэках, але і за яе межамі: праз прэсу, радыё, у школах горада і вёсак і г.д.

Такім чынам, папулярызацыя краязнаўчых ведаў ажыццяўляецца:

1. праз выдачу КД, назапашаных бібліятэкай;
2. сродкамі раскрыцця КФ у сістэме каталогаў, бібліяграфічных дапаможнікаў, баз даных для забеспячэння свабоднага доступа;
3. сродкамі правядзення масавых мерапрыемстваў, лекцый, кансультацый, выкананне даведак краязнаўчага характара, ажыццяўлення інфарміравання насельніцтва края аб новых КД і тых, якія знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі і за яе межамі;
4. праз вядзенне навукова-даследчай дзейнасці;
5. сродкамі зносін карыстальнікаў і бібліятэкараў;
6. формамі павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў па краязнаўстве [, с. 19].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распаўсюджванне краязнаўчых ведаў адбываецца праз выставы, правядзенне рознапланавых акцый, фестываляў, літаратурных вечарын, канферэнцый, прэзентацыйі, урокаў памяці.

Новымі перспектыўнымі відамі могуць стаць таксама іншыя формы працы: краязнаўчыя клубы, фальклорныя пасядзелкі, майстар-класы, гульні, квэсты, краязнаўчыя экскурсіі, конкурсы.

Такім чынам, работа па папулярызацыі краязнаўчых фондаў бібліятэк Ганцавіцкага раёна адлюстравана ў розных мерапрыемствах і пабудавана ў цесным супрацоўніцтве з сельскімі Дамамі культуры, клубамі, школамі, сельскімі Саветамі. Бібліятэкі эфектыўна выкарыстоўваюць пералічаныя формы і метады інфармацыйнага забеспячэння і папулярызацыі ведаў.

Работа па краязнаўстве невычэрпная. Бо кожны новы дзень уносіць у гісторыю штосьці сваё: цікавыя адкрыцці, новыя імёны, падзеі… Любая расліна расце ад кораня, а жыццё ідзе з былога ў будучае. І мы, бібліятэкары, як ніхто іншы, павінны захаваць гісторыю для будучых пакаленняў [3, с. 2].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Жывы свет мінуўшчыны: вопыт работы бібліятэкі аграгарадка Люсіна па зборы, захаванні і папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў/Ганцавіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, Аддзел бібліятэчнага маркетынгу; склад.: Т. Маляўка. – Ганцавічы: Ганцавіцкая РЦБС, 2013. – 12 с.

2. Кунцэвіч, Святлана. Рэклама ў бібліятэцы: вопыт Ганцавіцкай ЦБС / Святлана Кунцэвіч // Бібліятэчны свет. – 2016. - №6. – С. 19-21.

3. Маляўка, Таццяна. Вопыт і традыцыі бібліятэкі / Таццяна Маляўка // Савецкае Палессе. – 2016. – 12 ліст.(№88). – С. 2.

4. Маляўка, Таццяна. Калі натхняе конкурс: арганізацыя новых форм работы ў бібліятэцы / Таццяна Маляўка // ЛіМ. – 2019. – 18 студ.(№3). – С. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ